УДК 811.161.3:81'34

**В. А. Мандзік**
Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі

# КАНСАНАНТНАЯ ДЫСТРЫБУЦЫЯ ЗВОНКАГА ФРЫКАТЫЎНАГА [В] У БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРНАЙ МОВЕ

Мэта артыкула – выяўленне спецыфікі кансанантнай дыстрыбуцыі звонкага фрыкатыўнага [в] на прыкладзе спалучэнняў «выбухны + [в]», «афрыкатыўны + [в]». Акрэслены артыкуляцыйныя і акустычныя характарыстыкі зычнага, зроблена высновa пра яго асаблівы катэгарыяльна-функцыянальны статус: спалучэнне дыстрыбуцыйных уласцівасцей санорных і шумных. Прааналізаваны магчымыя кансанантныя групы з фрыкатыўным [в] у якасці першага (радзей) і другога (часцей) кампанента. Зроблены асцылаграфічны аналіз слоў *засве**чв**аць* і *засве**дчв**аць* для інструментальнага пацвярджэння функцыянавання сегментаў [чв] і [ч:в], якія выконваюць сэнсаадрознівальную функцыю. Паказана, што ўжыванне кансанантных груп структуры «зычны + [в]» немагчыма ў абсалютным канцы слоў. У іншых пазіцыях яно мае сваю спецыфіку ў залежнасці ад якасці першага кампанента. Так, у пачатку лексем прадуктыўнымі з'яўляюцца толькі сегменты з папярэднімі глухімі выбухнымі [кв], [тв]. Спалучэнні са звонкімі выбухнымі [дв], [gв], звонкімі і глухімі афрыкатамі [zв], [žв], [цв], [чв] у дадзенай пазіцыі маюць абмежаваны характар. Кансанантныя групы [пв], [бв] у пачатку слоў забаронены. У пазіцыі сярэдзіны слова дыстрыбуцыйныя магчымасці шчылiннага [в] больш шырокія. Тут павялічваецца інвентар прадуктыўных спалучэнняў зычных, у які ўваходзяць і забароненыя ў пачатку лексем сегменты [пв], [бв].

**Ключавыя словы:** беларуская мова, фанетыка, фаналогія, кансанантная сістэма, дыстрыбуцыя, спалучэнні зычных, правілы спалучальнасці.

**Для цытавання:** Мандзік В. А. Кансанантная дыстрыбуцыя звонкага фрыкатыўнага [в] у беларускай літаратурнай мове // Труды БГТУ. Сер. 4, Принт- и медиатехнологии. 2025. № 2 (297). С. 121–127.
DOI: 10.52065/2520-6729-2025-297-15.

**V. A. Mandzik**
Center for Research of Belarusian Culture, Language and Literature
of the National Academy of Sciences of Belarus

# CONSONANT DISTRIBUTION OF THE VOICED FRICATIVE [В] IN THE BELARUSIAN LITERARY LANGUAGE

The purpose of this article is to identify the specific features of the consonant distribution of the voiced fricative [в], using the example of "plosive + [в]" and "affricate + [в]" clusters. The articulatory and acoustic characteristics of the consonant are described, leading to the conclusion that it holds a special categorial and functional status, combining the distributional properties of both voiced sounds and obstruents. Possible consonant clusters with the fricative [в] as the first (less frequent) and second (more frequent) component are analyzed. An oscillographic analysis of the words *засве**чв**аць* and *засве**дчв**аць* is conducted to instrumentally confirm the function of the segments [чв] and [ч:в] in performing a distinctive (phonemic) role. The analysis shows that "consonant + [в]" clusters cannot occur in absolute word-final position. In other positions, their distribution has specific features depending on the quality of the first component. For instance, word-initially, only clusters with a preceding voiceless plosive, such as [кв] and [тв], are productive. Clusters with voiced plosives [дв], [gв] or with voiced and voiceless affricates [zв], [žв], [цв] and [чв] are restricted in this position. The consonant clusters [пв] and [бв] are prohibited word-initially. In word-medial position, the distributional possibilities of the fricative [в] are broader. Here, the inventory of productive consonant clusters increases, including segments such as [пв] and [бв], which are disallowed at the beginning of lexemes.

**Keywords:** Belarusian language, phonetics, phonology, consonant system, distribution, consonant combinations, combinability rules.

**For citation:** Mandzik V. A. Consonant distribution of the voiced fricative [в] in the Belarusian literary language. *Proceedings of BSTU, issue 4, Print- and Mediatechnologies*, 2025, no. 2 (297), pp. 121–127 (In Belarusian).
DOI: 10.52065/2520-6729-2025-297-15.

**Уводзіны.** У працэсе вывучэння фанетычнай сістэмы мовы важна ўлічваць не толькі комплекс уласцівых ёй гукаў, іх артыкуляцыйныя і акустычныя характарыстыкі, але і дыстрыбуцыйныя магчымасці і абмежаванні, якія накладваюцца на гукі ў працэсе маўлення. Паводле М. С. Трубяцкога, фаналогія павінна даследаваць суадносіны паміж гукавымі элементамі, правілы, па якіх гэтыя элементы спалучаюцца адзін з адным у словах і ў сказах [1, с. 18–19]. Спалучальныя магчымасці гукаў маюць сваю спецыфіку ў кожнай мове, таму падобныя назіранні важныя як для ўстанаўлення сінтагматычных адносін у фаналагічнай сістэме канкрэтнай мовы, так і для кампаратыўнага вывучэння дыстрыбуцыйных законаў у фанетыцы блізкароднасных моў. І калі агульныя правілы дыстрыбуцыі фанем у беларускай літаратурнай мове выяўлены, складзены рэестр найбольш характэрных для яе спалучэнняў (гл., напрыклад, [2–6]), то апісанне магчымасцей і забарон фанетычнай спалучальнасці для кожнага асобнага гука (або для класа гукаў), у тым ліку з мэтай параўнальнага вывучэння, застаецца актуальнай для айчыннай лінгвістыкі задачай.

Мэта дадзенага артыкула – выяўленне спецыфікі кансанантнай дыстрыбуцыі звонкага фрыкатыўнага [в], спалучальныя асаблівасці якога ў беларускай літаратурнай мове істотна адрозніваюцца ад тых, якія праяўляюцца ў блізкароднаснай рускай мове. Для дасягнення пастаўленай мэты будуць акрэслены артыкуляцыйныя і акустычныя характарыстыкі зычнага; адабраны магчымыя кансанантныя спалучэнні з ім і лексемы, якія ілюструюць функцыянаванне гэтых спалучэнняў у розных пазіцыях; пры неабходнасці зроблены асцылаграфічны аналіз адпаведных сегментаў у агучаных словах для больш дакладнай ідэнтыфікацыі фанетычнага акружэння, атрымання нагляднага ўяўлення пра акустычную структуру выяўленых карэляцый зычных. Такая работа адпавядае асноўным прынцыпам, устаноўленым для вывучэння кансанантнай дыстрыбуцыі [7].

**Асноўная частка.** Артыкуляцыйныя асаблівасці губных зычных, да якіх адносіцца цвёрды [в], заключаюцца ў абавязковым удзеле губ ва ўтварэнні гэтых гукаў. Пры вымаўленні [в] ніжняя губа ўнутраным бокам змыкаецца з верхнімі зубамі па краях, а спераду паміж ёю і двума пярэднімі цэнтральнымі зубамі застаецца шчыліна [8, с. 43–44]. Таму гэты гук паводле артыкуляцыйна-фізіялагічнай класіфікацыі зычных па пасіўным органе вызначаюць як губна-зубны шчылінны [9, с. 55]. У яго артыкуляцыі прымаюць удзел галасавыя звязкі – гэта звонкі фрыкатыўны зычны [9, с. 82]. Некаторыя даследчыкі, напрыклад П. Я. Юргелевіч, адносяць [в] да санорных, выкарыстоўваючы пры гэтым наступную дэфініцыю дадзенага класа гукаў: «Санорнымі называюцца такія зычныя, якія ўтвараюцца з голасу і шуму, але з перавагай голасу над шумам» [10, с. 73]. Сапраўды, паводле функцыянальных уласцівасцей гук [в] прымыкае да санорных: перад ім не адбываецца азванчэнне глухіх, таму парныя па звонкасці/глухасці зычныя захоўваюць здольнасць адрозніваць словы (***двор*** і ***твор***, ***зварыцца*** і ***сварыцца***). У гэтым заключаецца адна з галоўных дыстрыбуцыйных характарыстык зычнага [в]: ён утварае кансанантныя спалучэнні і са звонкімі, і з глухімі. З іншага боку, санорныя не маюць глухіх адпаведнікаў, і [в] у айчыннай лінгвістыцы сапраўды доўгі час адносілі да няпарных па звонкасці/глухасці [11, с. 31]. Аднак сучасныя эксперыментальна-фанетычныя даследаванні з прымяненнем інструментальных метадаў дазволілі даказаць функцыянаванне суадноснай пары «звонкі фрыкатыўны [в] / глухі фрыкатыўны [ф]» [12, с. 12]. Напрыклад, пры спалучэнні [ф] са звонкім [з] у слове *пра**фз**ахворванне* ўзнікае звонкі карэлят фрыкатыўнага: [прà**вз**ахвóрван’:э]. А ў запазычанай лексеме *дай**в**-клуб* [в] перад глухім [к] аглушаецца і чаргуецца з [ф]: [дàй**фк**лýп]. Такая рэалізацыя сёння з’яўляецца нарматыўнай: яна зафіксавана ў акадэмічным «Арфаэпічным слоўніку беларускай мовы» [13]. Такім чынам, можна гаварыць пра асаблівы катэгарыяльна-функцыянальны статус зычнага [в], які спалучае ў сабе характарыстыкі санорных і шумных. Гэта ўплывае на яго дыстрыбуцыйныя ўласцівасці.

Некаторыя звесткі пра кансанантныя спалучэнні, членам якіх з’яўляецца [в], пададзены ў даследаванні А. І. Падлужнага [2, с. 47–54]. У прыватнасці, адзначаецца тое, што гэты фрыкатыўны не можа выступаць у якасці першага члена ні двухгукавых, ні трохгукавых груп зычных незалежна ад іх становішча ў слове. Аднак гэтая заўвага не зусім дакладная: у іншых крыніцах гаворыцца пра магчымасць ужывання [в] у неўласцівым для яго становішчы – напрыклад, у словах ***в’ет**намец* [**вй**этнáм’эц], *інтэ**рв’**ю* [інтэ**рвй**ý], дзе функцыянуе спалучэнне [вй] са шчылінным [в] у прэпазіцыі [14, с. 30]. Гэтая кансанантная група сустракаецца і ў іншых запазычаннях, якія яшчэ не паспелі ўвайсці ў корпусы слоўнікаў, але ўжываюцца ў сродках масавай інфармацыі. Напрыклад: *У традыцыйным навагоднім адкрытым турніры па **в’ет** во даа, які пройдзе ў Віцебску 27–28 снежня, прымуць удзел каля 70 юных спартсменаў* (Звязда. 2022. 27 снеж. URL:https://zviazda.by/be/news/20221227/1672117885-kalya-70-yunyh-spartsmenau-prymuc-udzel-u-navagodnim-turniry-pa-vet-vo-dao).

Яшчэ адзін выпадак функцыянавання кансанантных спалучэнняў структуры «[в] + зычны» – азванчэнне [ф] перад наступнымі звонкімі, пра якое гаварылася вышэй. У выніку гэтага працэсу ўтвараюцца групы зычных [вб’] (*пра**фб**ілет*

[пра̀**вб'**іл'э́т]), [вγ], [вγ'] (*афганскі* [а**вγ**а́нск'і], *прафгігіена* [пра̀**вγ'**іγ'ійэ́на]), [вз] (*прафзахворванне* [пра̀**вз**ахво́рван':э]). Вымаўленне ў дадзеных спалучэннях замест [в] губнога [ў] дапускаецца толькі ў гутарковай мове [9, с. 130].

Неабходна заўважыць, што названыя вышэй спалучэнні зычных з [в] у прэпазіцыі маюць спарадычны характар, сустракаюцца ў абмежаванай колькасці лексем і адносяцца, па вызначэнні М. С. Трубяцкога, да анамальных [1, с. 270]. Для беларускай фанетычнай сістэмы характэрны спалучэнні зычных з [в] у постпазіцыі, і гэта галоўнае адрозненне дыстрыбуцыі дадзенага шчыліннага ад яго функцыянавання ў рускай мове, дзе [в] можа выступаць як першым, так і другім членам двухкампанентных кансанантных груп. Так, у рускай мове ўжываюцца сегменты [вд] (***вд**ова*, *пра**вд**а*) і [дв] (***дв**ажды*, *по**дв**орье*), у той час як у беларускай – толькі [дв] (***дв**аранка*, *ры**дв**ан*) [15, с. 332]. А ў тых лексемах славянскага паходжання, дзе [в] аказаўся ў пазіцыі перад зычнымі, на беларускай глебе развілося яго чарговаанне з губна-губным [ў], нехарактэрным для фанетычнай сістэмы рускай мовы: *ла**ў**ка*, *да**ў**но*, *апра**ў**данне* (руск. *ла**в**ка*, *да**в**но*, *опра**в**дание*).

Далей ахарактарызуем спецыфіку функцыянавання ў розных пазіцыях прадуктыўных для беларускай мовы сегментаў структуры «зычны + [в]», адабраных з корпуса «Арфаэпічнага слоўніка беларускай мовы».

**Спалучэнні «глухі выбухны + [в]».** Да глухіх выбухных зычных у беларускай мове адносяцца [п], [п'], [к], [к'], [т]. Двухкампанентныя групы шчылінны [в] утварае толькі з цвёрдымі выбухнымі. Нягледзячы на тое, што спалучэнні са шчыліннымі гукамі ў якасці другога члена для беларускай мовы рэдкія, фанетычная сістэма іх не забараняе. Так, у <u>пачатку слова</u> сустракаюцца некаторыя групы структуры «выбухны + шчылінны» (***кс**еракопія, **кс**ілаграфія*, ***кш**талтам, **бз**ыкнуць, **пс**аванне*). Што датычыць зычнага [в], то ў разглядаемай пазіцыі ён спалучаецца толькі з папярэднімі [т] і [к], утвараючы сегменты [тв], [кв] як у беларускіх каранях, так і ў словах неславянскага паходжання: ***кв**адратны* [**кв**адра́тны], ***кв**акаць* [**кв**а́кац'], ***кв**актуха* [**кв**акту́ха], ***кв**акша* [**кв**а́кша], ***кв**антавы* [**кв**а́нтавы], ***кв**ас* [**кв**ас], ***тв**аё* [**тв**айо́], ***тв**аністы* [**тв**а́н'істы], ***тв**арог* [**тв**аро́х], ***тв**орчасць* [**тв**о́рчас'ц'].

Адносна пазіцыі абсалютнага <u>канца слова</u> адзначым, што спалучэнні структуры «зычны + [в]» у такой пазіцыі для беларускай мовы неўласцівы. Арфаграфічныя сегменты з папярэднімі санорнымі сустракаюцца на канцы некаторых запазычаных лексем (*не**рв***, *рэзе**рв***, *рэ**йв***, *дра**йв***), аднак фанетычная рэалізацыя падобных спалучэнняў падпарадкоўваецца правілу аглушэння звонкіх на канцы слоў (утвараюцца групы зычных [рф], [йф]). Таму далей дадзеная пазіцыя разглядацца не будзе.

Больш шырокія магчымасці для ўзнікнення і функцыянавання спалучэнняў разглядаемай структуры дэманструе пазіцыя <u>сярэдзіны слова</u>. Ужо ўзгаданая кансанантная група [тв] у гэтым становішчы сустракаецца на стыку марфем (*аблы**тв**аць* [аблы́**тв**ац'], *абмо**тв**аць* [абмо́**тв**ац']), у межах суфіксальнай марфемы (*кля**тв**а* [кл'а́**тв**а], *малі**тв**а* [мал'і́**тв**а]), а таксама ў складаных словах з другой асновай, якая пачынаецца з *тв* (*бела**тв**ары* [б'эла**тв**а́ры]). Сегмент [кв] прадстаўлены ў беларускіх (*спа**кв**аля* [спа**кв**ал'а́], *бу**кв**ар* [бу**кв**а́р]) і іншамоўных (*се**кв**оя* [с'э**кв**о́йа], *тэ**кв**андо* [тэ**кв**андо́]) каранях; на стыку кораня і суфікса (*абма**кв**аць* [абма́**кв**ац'], *абшу**кв**аць* [апшу́**кв**ац']); у словах, дзе да асновы з пачатковым *кв* далучаецца прыстаўка або іншая аснова (*адна**кв**атэрны* [адна̀**кв**атэ́рны], *на**кв**асіць* [на**кв**а́с'іц']). Выключна ў сярэдзіне слова сустракаецца спалучэнне [пв], прычым у беларускай мове яно не бывае каранёвым, а ўзнікае на стыку кораня і суфікса (*адкалу**пв**аць* [аткалу́**пв**ац'], *атрэ**пв**аецца* [атрэ́**пв**ац:а], *выко**пв**анне* [выко́**пв**ан':э]). Адметна, што моўная сістэма дае магчымасць варыянтнай рэалізацыі адных і тых жа лексем – з кансанантнай групай [пв] і без яе: *дакіпваць* і *дакіпаць*, *папатрэпваць* і *папатрапаць*.

Адсутнічаюць дыстрыбуцыйныя абмежаванні пры спалучэнні [в] з папярэднімі [т], [к] і ў <u>становішчы сандхі</u> – на стыку частак кампазітаў і слоў, набліжаных да іх па сваёй акцэнтна-рытмічнай структуры, гэта значыць тых, у якіх можа ўзнікаць пабочны націск. Кансанантныя групы [кв], [тв] сустракаюцца ў лексемах *бэ**к-в**акал* [бэ̀**кв**ака́л], *палі**тв**ыхаванне* [пал'і̀**тв**ыхава́н':э], *інтэрнэ**т-в**ыданне* [інтэрнэ̀**тв**ыда́н':э] і іншых.

**Спалучэнні «звонкі выбухны + [в]».** Да звонкіх выбухных зычных у беларускай мове адносяцца [б], [б'], [g], [g'], [д]. Двухкампанентныя групы [в] утварае толькі з цвёрдымі выбухнымі. Прычым спалучэнне [gв] у беларускай фанетычнай сістэме не з'яўляецца распаўсюджаным. Справа ў тым, што «ў беларускай мове пад уздзеяннем іншых моў (польскай, літоўскай, ідыш), з якіх у старажытнасці адбывалася актыўнае запазычванне слоў, узнік і захоўваецца [g] выбухны, які зараз выступае як факультатыўны варыянт [γ] фрыкатыўнага, а ў маўленні часта ім замяняецца» [16, с. 75]. Колькасць такіх даўніх запазычанняў з выбухным [g] абмежаваная, адпаведна, нешматлікія і выпадкі функцыянавання кансанантнай групы [gв]. Так, у <u>пачатку слова</u> яна сустракаецца толькі ў лексеме ***гв**алт* [**gв**алт] і вытворных словах: ***гв**алтаваць* [**gв**алтава́ц'], ***гв**алтам* [**gв**а́лтам], ***гв**алтаўнік* [**gв**алтаўн'і́к] і інш. У дадзенай пазіцыі сустракаецца таксама сегмент [дв] – у абмежаванай колькасці каранёў славянскага паходжання

(*двайны* [**дв**айны́], *дваранка* [**дв**ара́нка], *дварцовы* [**дв**арцо́вы]). Што тычыцца звонкага [б], то ён не ўтварае спалучэнняў з [в] у пачатку слоў – так жа, як і яго глухі карэлят.

У становішчы сярэдзіны слова спарадычна сустракаецца сегмент [ɡв] – пераважна на стыку каранёвай і суфіксальнай марфем: *выслізгваць* [выс’л’і́з**ɡв**ац’], *пабразгванне* [пабра́з**ɡв**ан’:э]. Таксама тут ужываецца кансанантная група [дв] – у некаторых каранях (*рыдван* [ры**дв**а́н], *адвакацкі* [адвака́цк’і]); спалучэнні [бв] і [дв] – на стыку прыстаўкі і кораня (*абвастрыцца* [а**бв**астры́ц:а], *прадвызначыць* [пра**дв**ы́значыц’]), кораня і суфікса (*расхлёбваць* [расхл’о́**бв**ац’], *даведвацца* [дав’э́**дв**ац:а]). У апошнім выпадку назіраем прыклады варыянтнага ўтварэння формаў дзеясловаў і аддзеяслоўных назоўнікаў – за збегам зычных і без яго: *навыскубваць* і *навыскубаць*, *абкідванне* і *абкіданне*.

У пазіцыі сандхі функцыянуюць толькі групы [бв] і [дв]: *медвыцвярэзнік* [м’э̀**дв**ыц’в’арэ́з’н’ік], *вэб-выданне* [вэ̀**бв**ыда́н’:э].

**Спалучэнні «глухі афрыкатыўны + [в]».** Да глухіх афрыкатыўных зычных у беларускай мове адносяцца [ц], [ц’], [ч]. Двухкампанентныя групы [в] утварае толькі з цвёрдымі афрыкатамі. Спалучэнні [цв] і [чв] у пачатку слоў сустракаюцца ў абмежаванай колькасці лексем пераважна славянскага паходжання: *цвыркун* [**цв**ыркýн], *цвэгаць* [**цв**э́ɣац’], *чвакаць* [**чв**а́кац’], *чвалам* [**чв**а́лам], *чвартаванне* [**чв**артава́н’:э], *чвыр* [**чв**ыр]. У сандхіяльнай пазіцыі функцыянуе сегмент [цв]: *спецвопратка* [с’п’э**цв**о́пратка], *спецвыпуск* [с’п’э**цв**ы́пуск]. У становішчы сярэдзіны слова ўжываюцца: кансанантная група [чв] – у некаторых каранях (*пачвара* [па**чв**а́ра], *ночвы* [но́**чв**ы]); спалучэнні [чв] і [цв] – на стыку кораня і суфікса (*абмацваць* [абма́**цв**ац’], *абкручванне* [апкрý**чв**ан’:э], *абмалочваць* [абмало́**чв**ац’]).

Асаблівасць кансанантнай дыстрыбуцыі цвёрдага [в] у разглядаемай пазіцыі заключаецца ў тым, што ён можа спалучацца з падоўжаным [ч:], утвараючы кансанантную групу [ч:в]. Прычым гэтая група выконвае сэнсаадрознівальную функцыю: лексічнае значэнне слоў *засвечваць* [зас’в’э́**чв**ац’] і *засведчваць* [зас’в’э́**ч:в**ац’], якія ў маўленні адрозніваюцца толькі наяўнасцю/адсутнасцю падоўжанага сегмента, не супадае. Так, згодна з тлумачальным слоўнікам беларускай мовы [17], *засвечваць* – незакончанае трыванне да *засвяціць* ‘запаліць што-н. для асвятлення’; *засведчваць* – незакончанае трыванне да *засведчыць* ‘пасведчыць, пацвердзіць правільнасць чаго-н.; заверыць подпісам і пячаткай’.

Ідэнтыфікацыя гука [ч:] у кансанантнай групе [ч:в] як падоўжанага праводзілася намі як на аснове перцэптыўнага аналізу, так і з дапамогай асцылаграфічнага метаду. Акустычная структура глухіх афрыкат прадугледжвае наяўнасць глухой змычкі і выбуху, які пераходзіць у фрыкацыю [8, с. 75]. На мал. 1 прадстаўлены фрагмент асцылаграмы слова *засвечваць*. Сегмент, які адпавядае фрыкатыўнаму [ч] (выдзелены дзвюма вертыкальнымі лініямі), мае дакладна такую структуру, прычым змычка доўжыцца 50 мс, а выбухны элемент больш працяглы – 70 мс.




Мал. 1. Фрагмент асцылаграмы слова *засвечваць* з непадоўжаным [ч]

На падоўжаны характар афрыкатыўных гукаў пры асцылаграфічным аналізе ўказвае істотнае павелічэнне працягласці змычкі ў параўнанні з непадоўжанымі зычнымі. Выбух з фрыкацыяй пры гэтым па часе гучання можа таксама павялічвацца. Але асноўная ідэнтыфікацыйная прыкмета – менавіта ўзрастанне даўжыні змычкі да паказчыкаў, супараўнальных з працягласцю гучання выбуху [9, с. 75–76]. На мал. 2 прадстаўлены фрагмент асцылаграмы слова *засведчваць*. Сегмент, які адпавядае падоўжанаму фрыкатыўнаму [ч:] (выдзелены дзвюма вертыкальнымі лініямі), складаецца са змычкі працягласцю 120 мс і выбухнога элемента з такой жа працягласцю. Такім чынам, падаўжэнне змычкі больш чым у два разы дазваляе сцвярджаць, што ў слове *засведчваць* функцыянуе кансанантная група [ч:в] з падоўжаным афрыкатыўным [ч:].




Мал. 2. Фрагмент асцылаграмы слова *засведчваць* з падоўжаным [ч:]

**Спалучэнні «звонкі афрыкатыўны + [в]».** Да звонкіх афрыкатыўных зычных у беларускай мове адносяцца гукі [ʒ], [ʒ’], [ǯ]. Двухкампанентныя

групы [в] утварае толькі з цвёрдымі афрыкатамі. Спалучэнне [zв] нехарактэрнае для беларускай мовы, паколькі і сам цвёрды [z] рэдка ўжываецца ў маўленні [9, с. 78]. Яно функцыянуе ў пачатку слоў ***дзвынканне*** [**zв**ы́нкан’:э], ***дзвынкаць*** [**zв**ы́нкац’]. У дадзенай пазіцыі зафіксаваны толькі адзін выпадак рэалізацыі кансанантнай групы [žв] – ***джвагнуць*** [**žв**а́γнуц’]. У становішчы сярэдзіны слова спалучэнне [žв] ужываецца выключна на стыку кораня і суфікса (*абязво**дж**ванне* [аб’азво́**žв**ан’:э], *выгаро**дж**ваць* [выγаро́**žв**ац’], *забру**дж**вальнік* [забру́**žв**ал’н’ік]). Тут таксама існуюць варыянты формаў слоў без утварэння кансанантнай групы: *ахалоджванне* і *ахаладжэнне*, *папасядзець* і *папаседжваць*.

**Заключэнне**. Такім чынам, дыстрыбуцыйныя ўласцівасці шчыліннага [в] у беларускай літаратурнай мове абумоўлены яго асаблівым катэгарыяльна-функцыянальным статусам. Падобна санорным, ён утварае кансанантныя спалучэнні як з папярэднімі звонкімі, так і з глухімі: *малітва*, *рыдван*. Падобна шумным, ён уступае ў карэляцыйныя адносіны па звонкасці/глухасці, дзякуючы чаму дыстрыбуцыя [в] пашыраецца нетыповымі для беларускай фанетычнай сістэмы кансанантнымі групамі [вб’], [вγ], [вγ’], [вз], якія функцыянуюць толькі ў становішчы сандхі.

Для беларускай літаратурнай мовы характэрны спалучэнні зычных з [в] у постпазіцыі. Гэта асноўнае адрозненне дыстрыбуцыі дадзенага шчылінага ад яго функцыянавання ў рускай мове. Ужыванне кансанантных груп структуры «зычны + [в]» немагчыма ў абсалютным канцы слоў, у іншых пазіцыях яно мае сваю спецыфіку ў залежнасці ад якасці першага кампанента. Так, у пачатку лексем прадуктыўнымі з’яўляюцца толькі сегменты з папярэднімі глухімі выбухнымі [кв], [тв]. Спалучэнні са звонкімі выбухнымі [дв], [gв], звонкімі і глухімі афрыкатамі [zв], [žв], [цв], [чв] у дадзенай пазіцыі маюць абмежаваны характар. Кансанантныя групы [пв], [бв] у пачатку слоў забаронены.

У пазіцыі сярэдзіны слова дыстрыбуцыйныя магчымасці шчылінага [в] больш шырокія. Папершае, павялічваецца інвентар прадуктыўных спалучэнняў зычных, у які ўваходзяць і забароненыя ў пачатку лексем сегменты [пв], [бв] (***аб**вастрыцца*, *выко**пв**анне*). Па-другое, падоўжаныя і непадоўжаныя зычныя, утвараючы кансанантныя групы з [в], у ідэнтычным фанетычным акружэнні могуць выконваць сэнсаадрознівальную функцыю (*засве**чв**аць* [зас’в’э́**чв**ац’] і *засве**дчв**аць* [зас’в’э́**ч:в**ац’]). Пры гэтым функцыянаванне сегмента [ч:в] з падоўжанай афрыкатай пацверджана інструментальна.

Назіранні над дыстрыбуцыяй шчылінага [в] паказваюць, што беларуская мова валодае рэсурсам для таго, каб пазбягаць кансанантных спалучэнняў у пэўных словаформах, імкнучыся да максімальнай колькасці складоў структуры «зычны + галосны». Гэта пацвярджаецца магчымасцю варыянтнай рэалізацыі адных і тых жа лексем – з кансанантнымі групамі [пв], [žв] і без іх: *дакіпваць* і *дакіпаць*, *папатрэпваць* і *папатрапаць*.

## Спіс літаратуры

1. Трубецкой Н. С. Основы фонологии. М.: Аспект Пресс, 2000. 352 с.

2. Падлужны А. І. Фаналагічная сістэма беларускай літаратурнай мовы. Мінск: Навука і тэхніка, 1969. 144 с.

3. Падлужны А. І. Дыстрыбуцыйныя класы фанем у беларускай мове // Выбраныя працы / А. І. Падлужны. Мінск: Беларуская навука, 2015. С. 87–97.

4. Выгонная Л. Ц. Спалучэнні гукаў у межах слова // Фанетыка беларускай літаратурнай мовы / І. Р. Бурлыка [і інш.]. Мінск: Навука і тэхніка, 1989. С. 142–235.

5. Чахоўскі Г. К. Сінтагматычныя адносіны ў фаналогіі // Фанетычная праграма слова ў функцыянальна-стылістычным і эксперыментальным аспектах: сучасны стан і перспектывы: матэрыялы Міжнарод. навук. канф., Мінск, 20–21 лістап. 2012 г. Мінск, 2012. С. 240–244.

6. Мандзік В. А. Пашырэнне дыстрыбуцыйных магчымасцей зычных у сучаснай беларускай літаратурнай мове (на прыкладзе трохчленных кансанантных спалучэнняў) // Беларуская лінгвістыка. 2023. Вып. 90. С. 43–48.

7. Мандзік В. А. Прынцыпы даследавання кансанантнай дыстрыбуцыі ў беларускай літаратурнай мове // Труды БГТУ. Сер. 4, Принт- и медиатехнологии. 2024. № 2 (285). С. 140–144. DOI: 10.52065/2520-6729-2024-285-19.

8. Фанетыка беларускай літаратурнай мовы / І. Р. Бурлыка [і інш.]. Мінск: Навука і тэхніка, 1989. 335 с.

9. Крывіцкі А. А., Падлужны А. І. Фанетыка беларускай мовы. Мінск: Вышэйшая школа, 1984. 269 с.

10. Юргелевіч П. Я. Курс сучаснай беларускай мовы з гістарычнымі каментарыямі. Мінск: Вышэйшая школа, 1974. 301 с.

11. Кароткая граматыка беларускай мовы: у 2 ч. / навук. рэд. А. А. Лукашанец. Мінск: Беларус. навука, 2007. Ч. 1: Фаналогія. Марфаналогія. Марфалогія. 351 с.

12. Мандзік В. А. Сучасная беларуская арфаэпія: норма і узус: аўтарэф. дыс. … канд. філал. навук: 10.02.01. Мінск, 2016. 22 с.

13. Арфаэпічны слоўнік беларускай мовы / В. П. Русак [і інш.]. Мінск: Беларуская навука, 2017. 757 с.

14. Кривицкий А. А., Михневич А. Е., Подлужный А. И. Белорусский язык для небелорусов. Минск: Вышэйшая школа, 1973. 272 с.

15. Мандик В. А. Учет специфики дистрибуции щелевого [в] при изучении белорусского языка в билингвальной аудитории // Совершенствование методики обучения языкам: площадка обмена прогрессивной практикой: материалы IX Междунар. науч.-метод. онлайн-семинара. Казань, 13 фев. 2025 г. Казань, 2025. С. 331–334.

16. Першы даведнік па культуры беларускага вымаўлення / В. П. Русак [і інш.] // Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук. 2019. Т. 64, № 1. С. 69–80.

17. Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы: больш за 65 000 слоў / пад рэд. М. Р. Судніка, М. Н. Крыўко. 3-е выд. Мінск: БелЭн, 2002. 784 с.

**References**

1. Trubetskoy N. S. *Osnovy fonologii* [Fundamentals of phonology]. Moscow, Aspekt Press Publ., 2000. 352 p. (In Russian).

2. Padluzhny A. I. *Fanalagichnaya sistema belaruskay litaraturnay movy* [Phonological system of the Belarusian literary language]. Minsk, Navuka i tekhnika Publ., 1969. 144 p. (In Belarusian).

3. Padluzhny A. I. Distributive classes of phonemes in the Belarusian language. *Vybranyya pratsy* [Selected works]. Minsk, Belaruskaya navuka Publ., 2015, pp. 87–97 (In Belarusian).

4. Vygonnaya L. Ts. Combinations of sounds within a word. In: Burlyka I. R., Vygonnaya L. Ts., Losik G. V., Padluzhny A. I. *Fanetyka belaruskay litaraturnay movy* [Phonetics of the Belarusian literary language]. Minsk, Navuka i tekhnika Publ., 1989, pp. 142–235 (In Belarusian).

5. Chakhouski G. K. Syntagmatic relations in phonology. *Fanetychnaya pragrama slova u funktsyyanal'na-stylistychnym i eksperymental'nym aspektakh: suchasny stan i perspektyvy: materyyaly Mizhnarodnay navukovay kanferentsyi* [Phonetic program of the word in functional-stylistic and experimental aspects: current state and prospects: proceedings of the International scientific conference]. Minsk, 2012, pp. 240–244 (In Belarusian).

6. Mandzik V. A. Expansion of consonant distribution in the contemporary Belarusian literary language (a case study of three-consonant clusters). *Belaruskaya lingvistyka* [Belarusian linguistics], 2023, vol. 90, pp. 43–48 (In Belarusian).

7. Mandzik V. A. Research principles of consonantal distribution in the Belarusian language. *Trudy BGTU* [Proceedings of BSTU], issue 4, Print- and Mediatechnologies, 2024, no. 2 (285), pp. 140–144. DOI: 10.52065/2520-6729-2024-285-19 (In Belarusian).

8. Burlyka I. R., Vygonnaya L. Ts., Losik G. V., Padluzhny A. I. *Fanetyka belaruskay litaraturnay movy* [Phonetics of the Belarusian literary language]. Minsk, Navuka i tekhnika Publ., 1989. 335 p. (In Belarusian).

9. Kryvitski A. A., Padluzhny A. I. *Fanetyka belaruskay movy* [Phonetics of the Belarusian language]. Minsk, Vysheyshaya shkola Publ., 1984. 269 p. (In Belarusian).

10. Yurgelevich P. Ya. *Kurs suchasnay belaruskay movy z gistarychnymi kamentaryyami* [A course in contemporary Belarusian with historical commentaries]. Minsk, Vysheyshaya shkola Publ., 1984. 301 p. (In Belarusian).

11. Arashonkava G. U., Bulyka A. M., Kuntsevich L. P., Lukashanets A. A., Nikalaeva V. M., Padluzhny A. I., Rusak V. P., Shuba P. P. *Karotkaya gramatyka belaruskay movy. Chastka 1. Fanalogiya. Marfanalogiya. Marfalogiya* [Brief grammar of the Belarusian language. Part 1. Phonology. Morphonology. Morphology]. Minsk, Belaruskaya navuka Publ., 2007. 351 p. (In Belarusian).

12. Mandzik V. A. *Suchasnaya belaruskaya arfaepiya: norma i uzus. Autareferat dysertatsyi kandydata filalagichnykh navuk* [Modern Belarusian orthoepy: norm and usage. Abstract of thesis PhD (Philology)]. Minsk, 2016. 22 p. (In Belarusian).

13. Getsevich Yu. S., Lysy S. I., Mandzik V. A., Rusak V. P. *Arfaepichny slounik belaruskay movy* [Orthoepic dictionary of the Belarusian language]. Minsk, Belaruskaya navuka Publ., 2017. 757 p. (In Belarusian).

14. Krivitskiy A. A., Mikhnevich A. E., Podluzhnyy A. I. *Belorusskiy yazyk dlya nebelorusov* [Belarusian language for non-Belarusians]. Minsk, Vysheyshaya shkola Publ., 1973. 272 p. (In Russian).

15. Mandik V. A. Addressing the specific distribution of the fricative [в] in teaching Belarusian to a bilingual audience. *Sovershenstvovaniye metodiki obucheniya yazykam: ploshchadka obmena progressivnoy praktikoy: materialy IX Mezhdunarodnogo nauchno-metodicheskogo onlayn-seminara* [Advancement

of language teaching methodology: a platform for sharing best practices: proceedings of the IX International Scientific and Methodological Online Seminar]. Kazan', 2025, pp. 331–334 (In Russian).

16. Rusak V. P., Mandzik V. A., Getsevich Yu. S., Lysy S. I. The first handbook of standard Belarusian pronunciation. *Vestsi Natsyyanal'nay akademii navuk Belarusi* [Proceedings of the National Academy of Sciences of Belarus], Humanities Series, 2019, vol. 64, no. 1, pp. 69–80 (In Belarusian).

17. *Tlumachal'ny slounik belaruskay litaraturnay movy: bol'sh za 65 000 slou* [Dictionary of Belarussian literary language: more than 65,000 words]. Ed. by M. R. Sudnik, M. N. Kryuko. Minsk, BelEn Publ., 2002. 784 p.

**Інфармацыя пра аўтара**

**Мандзік Вераніка Аляксандраўна** – кандыдат філалагічных навук, дацэнт, старшы навуковы супрацоўнік аддзела сучаснай беларускай мовы. Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі (вул. Сурганава, д. 1, корп. 2, 220072, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь). E-mail: vieron9@mail.ru

**Information about the author**

**Mandzik Veranica Alyaksandrauna** – PhD (Philology), Associate Professor, Senior Researcher, the Department of Modern Belarusian language. Center for Research of Belarusian Culture, Language and Literature of the National Academy of Sciences of Belarus (1/2 Surganova str., 220072, Minsk, Republic of Belarus). E-mail: vieron9@mail.ru

*Паступіў 31.07.2025*